# Рэспубліка Беларусь у сусветным супольніцтве на сучасным этапе.




КАНСТЫТУЦЫЯ
РЭСПУБЛІКІ
БЕЛАРУСЬ
КОНСТИТУЦИЯ
РЕСПУБЛИКИ
БЕЛАРУСЬ


За сильную и процветающую Беларусь!



## Беларусь – раўнапраўны член сусветнага супольніцтва.

Распад СССР паклаў пачатак прынцыпова новаму этапу ў міжнародным жыцці Беларусі. Яе статус дзяржаўнай незалежнасці, як і ўсіх іншых саюзных рэспублік, прызнаны міжнародным згуртаваннем.

Беларусь стала паўнапраўным удзельнікам Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, членам Міжнароднага валютнага фонду, Сусветнага банка рэканструкцыі і развіцця, наладжвае ўзаемаадносіны з Еўрапейскім эканамічным саюзам, ратыфікавала Дагавор аб скарачэнні і абмежаванні стратэгічнага наступальнага ўзбраення і інш.



Беларусь в международном сообществе
СЕВЕРНЫЙ ЛЕДОВИТЫЙ ОКЕАН
АТЛАНТИЧЕСКИЙ ОКЕАН
ТИХИЙ ОКЕАН
Нью-Йорк (представительство Беларуси в ООН с 1945 г.)
Цифрами обозначены:
1 Беларусь
2 Испания
3 Ватикан
4 Грузия
5 Армения
6 Азербайджан
7 Туркменистан
8 Узбекистан
9 Таджикистан
10 Кыргызстан
11 Венесуэла
12 Вьетнам
Страны, в которых есть внешнеполитические представительства Республики Беларусь
Страны, с которыми установлены дипломатические отношения
Страны — члены СНГ
РОССИЯ Страны — члены ЕврАзЭС
Основные внешнеторговые связи Беларуси (толщина стрелки соответствует интенсивности товарообмена)
в США
в Китай
в Бразилию

Знаходзячыся ў складзе СССР, Беларусь праводзіла ўзгоднены з цэнтральнымі органамі знешнепалітычны курс, удзел яе ў шматлікіх міжнародных арганізацыях насіў фармальны характар. Атрымаўшы незалежнасць, Беларусь стала праводзіць самастойны знешнепалітычны курс, асабліва ў межах дзейнасці ААН.



У апошнія гады Беларусь выступае таксама ў ліку сааўтараў па рэзалюцыях аб раззбраенні, умацаванні мер даверу, праве народаў на жыццё ва ўмовах міру.

Яна з’явілася ўдзельнікам амаль 160 дзеючых міжнародных пагадненняў і актаў.

Ужо ў «Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР» было аб’яўлена, што Беларусь мае мэту зрабіць сваю тэрыторыю бяз’ядзернай зонай, а рэспубліку – ***нейтральнай дзяржавай (1)***

У адпаведнасці з гэтым знешнепалітычным курсам ядзерная зброя ў 1996 г. поўнасцю выведзена за межы нашай краіны.

***Гістарычны факт.*** Беларусь стала першай ў свеце дзяржавай, якая добраахвотна адмовілася ад валодання ядзернай зброяй. Другім крокам на шляху раззбраення стала падпісанне ў лютым 1995 года Пагадненне аб калектыўнай бяспецы паміж краінамі СНД.

Беларусь падтрымлівае сувязі з міжнароднымі арганізацыямі, якія займаюцца міратворчай дзейнасцю, прымае ўдзел у руху параднёных гарадоў. Так, Мінск звязаны з Ліёнам у Францыі, Дэтройтам у ЗША, Натынгемам у Англіі, Бангалорам у Індыі.

**Перабудова гандлева-эканамічных і навуковых сувязей.** На рубяжы 80-90-х гадоў якасна новы характар набылі гандлева-эканамічныя сувязі рэспублікі з замежнымі краінамі. Існуючы эканамічны патанцыял рэспублікі, выгаднае геаграфічнае размяшчэнне садзейнічалі развіццю новых форм знешнеэканамічных зносін, перш за ўсё стварэнню сумесных з замежнымі фірмамі прадпрыемстваў, устанаўленню прамых і вытворчых навукова-тэхнічных сувязей.






С РОЖДЕСТВОМ
И НОВЫМ ГОДОМ!
АТЛАНТ

Каля 100 прадпрыемстваў і аб’яднанняў рэспублікі ўстанавілі прамыя вытворчыя і навукова-тэхнічныя сувязі з замежнымі партнерамі, у іх ліку аб’яднанні «БелаўтаМАЗ», «Мінскі трактаны завод»,  «Палімір», «Атлант», і інш.

Таму, калі Рэспубліка набыла дзяржаўны суверэнетэт, яна атрымала не эканамічную самастойнасць, а механічна адрэзаны кавалак усё той жа адзінай саюзнай прамысловасці.

Былі парушаны неабходныя для існавання нармальнага эканамічнага механізма сувязі, і ў першую чаргу з краінамі так званага блізкага замежжа, гэта значыць былымі рэспублікамі СССР і яго саюзнікамі ў Еўропе.

Узнікшая праблема сёння вырашаецца на шляху пераходу да рынку ў межах СНД.

Як вам ужо вядома, штабкватэра СНД размяшчаецца ў Мінску.

Рэспубліка падтрымлвала сувязі з замежнымі краінамі таксама ў галіне навукі, культуры. Каля 30 інстытутаў АН Беларусі і звыш 90 навукова-даследчых установ розных краін ажыццявілі за гэтыя гады сумесную распрацоўку больш за 70 навуковых праблем і асобных тэм па розных галінах ведаў. Штогод каля 5,5 тысяч замежных студэнтаў навучаліся ў ВНУ і тэхнікумах Рэспублікі.

Духоўнаму ўзаемаўзбагачэнню народаў служылі дні нацыянальных культур, абмены мастакамі і самадзейнымі калектывамі, выстаўкамі, кінафільмамі.

Сёння Беларусь праводзіць курс на ўмацаванне эканамічнага ўзаемадзеяння СНД, хутчэйшае фарміраванне ўсходнееўрапейскага рынку, стварэнне ўмоў для паступовай інтэграцыі яго з Еўрапейскім супольніцтвам і ўтварэнне агульнага рынку Еўропы. Удзяляецца ўвага развіццю двухбаковых эканамічных адносін з еўрапейскімі дзяржавамі.

***Нейтральная дзяржава*** **–** дзяржава, знешнепалітычны курс якой характарызуецца няўдзелам ва ўзброеных канфліктах (войнах).

**Вывад.** Месца Беларусі ў сусветным супольніцтве вызначаецца яе знешнепалітычным курсам на стварэнне бяз’ядзернай зоны і ператварэнне ў нейтральную дзяржаву, паглыбленнем і развіццём шматвектарнай знешняй палітыкі пры адначасовым умацаванні асобных эканамічных, палітычных і культурных зносін з Расіяй.